# Мой універсітэт

Баранавіцкая ўніверсітэцкая газета
Выдаецца з 15 кастрычніка 2004 года

Спецвыпуск, красавік 2012

E-mail: news.barsu@mail.ru



*Падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве з Міжнародным эканоміка-гуманітарным універсітэтам імя С. Дзем'янчука*

# Прывітанне з БарДУ

***Штогод з 2005 года праходзяць сустрэчы выкладчыкаў і студэнтаў Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Міжнароднага эканоміка-гуманітарнага ўніверсітэта імя С. Дзем'янчука (г. Роўна, Украіна).***

Менавіта ў гэтым годзе, 25 кастрычніка, рэктар Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта В. Качурка і рэктар Міжнароднага эканоміка-гуманітарнага ўніверсітэта А. Дзем'янчук падпісалі дагавор «Аб двухбаковым супрацоўніцтве паміж БарДУ і МЭГУ ім. С. Дзем'янчука». 26 кастрычніка 2010 года дагавор быў працягнуты на наступныя пяць гадоў.

Галоўная задача дзейнасці ўніверсітэтаў — развіццё міжнародных сувязяў, узаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж вну.

У рамках праграмы арганізацыі супрацоўніцтва паміж універсітэтамі Беларусі і Украіны праходзяць сустрэчы творчых калектываў, студэнты і выкладчыкі двух універсітэтаў прымаюць удзел у сумесных навукова-практычных мерапрыемствах.

Арганізацыя супрацоўніцтва, а таксама актыўнае наладжванне і ўмацаванне сувязяў паміж суседнімі славянскімі краінамі, гістарычна злучанымі агульнасцю паходжання сваіх народаў і блізкасцю культур, маюць велізарнае значэнне, асабліва ў сферы адукацыі. Гэта звязана з тым, што менавіта правядзенне міжуніверсітэцкіх студэнцкіх культурна-масавых і дасугавых мерапрыемстваў, арганізацыя сустрэч як студэнтаў, так і адміністрацыі ўніверсітэтаў, а таксама мерапрыемстваў, накіраваных на супрацоўніцтва ў сферы навукова-практычнай дзейнасці, дазваляюць ствараць неабходныя спрыяльныя ўмовы

*Пачатак. Заканчэнне на с. 2.*

Заканчэнне. Пачатак на с. 1.

# Прывітанне з БарДУ



*Дэлегацыю БарДУ сустракаюць студэнты МЭГУ імя С. Дзем'янчука*

для далейшага эфектыўнага развіцця адукацыйных устаноў краіны. Акрамя таго, арганізацыя міжуніверсітэцкіх сустрэч дае магчымасць данесці да моладзі іншых нацыянальнасцяў звесткі пра нашу ўнікальную нацыянальную культуру, бліжэй пазнаёміць маладое пакаленне са звычаямі і традыцыямі дружалюбных братэрскіх народаў.

Штогадовы візіт дэлегацыі выкладчыкаў і студэнтаў БарДУ ў г. Роўна заўсёды незабыўны і прыносіць яе ўдзельнікам шмат пазітыўных эмоцый і ўражанняў. Сустрэчы студэнтаў і кіраўніцтва вну даюць штуршок да збліжэння двух універсітэтаў, двух народаў, дзвюх культур, спрыяюць стварэнню ўмоў для далейшага супрацоўніцтва.

У маі 2012 года мы чакаем дэлегацыю выкладчыкаў і студэнтаў Міжнароднага эканоміка-гуманітарнага ўніверсітэта імя С. Дзем'янчука.

# Творчасць не мае межаў. МЫ — СЯБРЫ НАЗАЎЖДЫ!

***Мастацкія калектывы студэнцкага культурна-творчага цэнтра Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта рыхтуюцца да «Вясенняй гастролі».***

Сёлета, у красавіку, творчая дэлегацыя з БарДУ ў чарговы раз наведае сваіх сяброў з Украіны — Ровенскі Міжнародны эканоміка-гуманітарны ўніверсітэт імя С. Дзем'янчука. Абмен творчымі дэлегацыямі вну дзвюх краін стаў добрай традыцыяй.

Новай сустрэчы студэнты чакаюць з нецярпеннем, бо падчас яе іх аб'ядноўвае бадзёры настрой, невычарпальны аптымізм маладосці, яе энергічнасць і крэатыўнасць. Сапраўды, абмен творчымі дэлегацыямі вну спрыяе духоўнаму ўзбагачэнню, развіццю добрасуседскіх адносінаў, умацаванню інтэлектуальна-творчага саюза ўніверсітэтаў, полікультурнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

У межах сустрэч паміж універсітэтамі неад'емнай часткай сталі выступленні творчых калектываў, падчас якіх устанаўліваюцца творчыя кантакты, завязваюцца сяброўскія сувязі паміж людзьмі.

І на гэты раз пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў студэнцкага культурна-творчага цэнтра БарДУ для гледачоў Ровенскага Міжнароднага эканоміка-гуманітарнага ўніверсітэта імя С. Дзем'янчука рыхтуецца новая канцэртная праграма.

Нягледзячы на тое, што маладыя людзі жывуць у розных краінах, яны маюць агульныя інтарэсы. І паразуменне знаходзяць вельмі лёгка. Таму з упэўненасцю можна сцвярджаць, што сувязі, у якіх задзейснена моладзь дзяржаў-суседак, будзе меццъ працяг не адзін год, бо ўсе мы імкнемся жыць па-сяброўску, тым больш, што задачай прагрэсіўнага развіцця краін, у першую чаргу, з'яўляецца — умацаванне духоўнага адзінства брацкіх народаў.

Трэба адзначыць, што такія сустрэчы адбываюцца дзякуючы рэктару Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта В. Качурка і рэктару Міжнароднага эканоміка-гуманітарнага ўніверсітэта імя С. Дзем'янчука А. Дзем'янчуку. Выказваем ім падзяку за падтрымку творчых ініцыятыў моладзі.

**ІНА ГАНЧАР,**
***метадыст СКТЦ***

# Студэнцкі культурна-творчы цэнтр БарДУ вітае сваіх сяброў!



***Народны тэатр мініяцюр «Сафіт»***

*Гэта гумарыстычныя комік-мініяцюры, пародыі, спектаклі пра каханне, студэнцкае жыццё. Гэта тэматычныя літаратурна-паэтычныя кампазіцыі, канферанс вядучых канцэртных і шоў-праграм. Вядучыя акцёры тэатра з'яўляюцца неаднаразовымі пераможцамі абласных і рэспубліканскіх конкурсаў акцёрскага майстэрства. Рэжысёр — Ганна Грэзе.*



***Ганна Уладзіміраўна Грэзе,*** *дырэктар студэнцкага культурна-творчага цэнтра БарДУ*



***Мікалай Сяргееў,*** *мастацкі кіраўнік народнага ансамбля «Музычны гасцінец»*

***Народны ансамбль «Музычны гасцінец»***

*Гэта лірычныя і вясёлыя беларускія і рускія песні, шчырыя і добразнаёмыя музычныя творы.*

*Мастацкі кіраўнік — Мікалай Сяргееў.*





***Харэаграфічная група «Імпрэза»***

*Гэта беларускія, рускія, украінскія народныя танцы, харэаграфічныя кампазіцыі сучаснай пластыкі і накірункаў.*

*Мастацкі кіраўнік — Паліна Паўлючэнка*



*Юлія Бурэц*, *вакалістка народнай студыі эстраднай песні «Талент»*



***Народная студыя эстраднай песні «Талент»***

*Гэта лепшыя сучасныя творы беларускай, рускай і замежнай эстрады ў выкананні маладых таленавітых вакалістаў, дуэтаў. Гэта непаўторны тэатр песні Алы Пугачовай у выкананні педагога-псіхолага ўніверсітэта. Вядучыя вакалісты народнай студыі з'яўляюцца пераможцамі абласных і рэспубліканскіх конкурсаў.*

*Мастацкія кіраўнікі — Надзея Семянкова і Сяргей Кобрын*



***Народны тэатр моды «Світа»***

*Гэта яркае тэатралізаванае дзеянне з дэфіле. Гэта творчы саюз калектыва тэатра і кафедры тэхналогіі педагагічнага факультэта, які рэалізаваўся ў калекцыях «Вечар запальвае свечы», «Беларускі мадэрн», «Гламур», «Белыя росы» і інш.*

*Калектыў тэатра з'яўляецца неаднаразовым лаўрэатам і дыпламантам рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, а яго ўдзельніцы — Вольга Багатырэвіч і Марына Казека — сталі пераможцамі Нацыянальных конкурсаў прыгажосці ў 2006 і 2010 гадах.*

*Мастацкі кіраўнік — Марына Лукашэвіч*

***Крысціна Кобрын***, *удзельніца клуба «Я і гітара»*



***Клуб «Я і гітара»***

*Гэта аб'яднанне аматараў аўтарскай песні, баллад, фолк-рока, якія выконваюць творы на рускай і беларускай мовах.*

*Мастацкі кіраўнік — Таццяна Корсак*

## *Мы чакаем Вас, украінскія сябры, са зваротным творчым візітам!*

Нумар падрыхтавалі: М. М. Матчэня, Т. Р. Якубовіч, П. І. Папко. Адказны за выпуск М. М. Матчэня.

Наш адрас: 225404, Брэсцкая вобласць, г. Баранавічы, вул. Войкава, 21, каб. 110, e-mail: news.barsu@mail.ru. Тэл.: 8(0163) 45-78-60.

Выдаецца з кастрычніка 2004 года.

Камп`ютарная вёрстка М. М. Матчэні.